


# СА СВЯТАМ ПЕРШАМАЯ!

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ЎНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

| № 14 (609) | Аўторак, 30 красавіка 1985 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап. |
|---|---|---|---|

**Няхай жыве 1 Мая — Дзень міжнароднай салідарнасці працоўных!**

(З Заклікаў ЦК КПСС)

## УРАЧЫСТЫ ВЕЧАР

**27-га красавіка ў актавай зале ГДУ адбыўся сход вучоных, выкладчыкаў, студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта, прысвечаны святу 1-га Мая. З дакладам аб Дні міжнароднай салідарнасці працоўных усяго свету выступіў старшыня прафкома М. Н. Мурашка.**

**На сходзе быў зачытаны загад па ўніверсітэту, у якім рэктар ГДУ акадэмік АН БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР Б. В. Бокуць павіншаваў увесь калектыў са святам міру, вясны і працы, а лепшым выкладчыкам, студэнтам і супрацоўнікам за поспехі ў працы і вучобе аб'явіў падзяку.**

**Удзельнікі мастацкай самадзейнасці ўніверсітэта выступілі са святочным канцэртам.**

## АБ ПЕРШАМАЙСКАЙ ДЭМАНСТРАЦЫІ

**Заўтра прадстаўнікі ўсіх факультэтаў, кафедр і структурных падраздзяленняў універсітэта прымуць удзел у Першамайскай дэманстрацыі працоўных г. Гомеля. Збор — да 8 гадзін 30 мінут. У 9 гадзін зводная калона ГДУ адправіцца на цэнтральную плошчу імя У. І. Леніна.**

## *У гонар Дня Перамогі*

**ТАВАРЫШЫ! ПА ІНІЦЫЯТЫВЕ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І АРГАНІЗАЦЫЙ ГАРАДОЎ-ГЕРОЯЎ МАСКВЫ, ЛЕНІНГРАДА І ВАЛГАГРАДА Ў НАШАЙ КРАІНЕ ПРАВОДЗІЦЦА ЎСЕСАЮЗНЫ КАМУНІСТЫЧНЫ СУБОТНІК, ПРЫСВЕЧАНЫ 40-ГОДДЗЮ ПЕРАМОГІ САВЕЦКАГА НАРОДА Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ. ПРЫМЕМ У ІМ АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ!**

## *ВІНШУЕМ!*

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры педагогікі і псіхалогіі горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры ЛЫТКО Аляксандра Аляксандравіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук.**

# ПЕРАМОЖНЫ МІРНЫ МАЙ

Ардэнаносны Гомель, як усе гарады і населеныя пункты нашай неабсяжнай краіны, — у святочным убранні. Пасля Усесаюзнага камуністычнага суботніка, прысвечанага 115-й гадавіне з дня нараджэння стваральніка Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы У. І. Леніна, прыкметна папрыгажэлі вуліцы і паркі, плошчы і скверы. З выдатным настроем, новым палітычным і працоўным уздымам сустракаюць савецкія людзі дзень Першамая. На шматлікіх будынках палымнеюць палотнішчы з натхняльнымі Заклікамі ЦК КПСС, добра зразумелымі і дарагімі для нас словамі: «Мір. Праца. Май», «Свабода. Роўнасць. Братэрства. Шчасце».

Чырвоныя сцягі Першамая лунаюць над усёй планетай. Ва ўсіх краінах свету, на ўсіх кантынентах працоўныя ўрачыста адзначаюць Дзень міжнароднай салідарнасці і братэрства людзей працы, дзень агляду сваіх сіл у барацьбе супраць імперыялізму і рэакцыі, за права жыць ва ўмовах міру і сацыяльнай справядлівасці.

Сёлетні Першамай для ўсіх народаў Краіны Саветаў асабліва радасны. Ён папярэднічае слаўнаму 40-годдзю Вялікай Перамогі над гітлераўскай Германіяй і мілітарысцкай Японіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 г.г. У гонар гэтай гістарычнай даты яе ўдзельнікі ўдастоены высокіх урадавых узнагарод — юбілейных медалёў, ордэнаў Айчыннай вайны I і II ступеняў. Гэта — яскравае сведчанне высокай ацэнкі гераічнага подзвігу воінаў, партызан і падпольшчыкаў у кровапралітнай барацьбе з захопнікамі.

**Б. В. БОКУЦЬ,**
**рэктар універсітэта, акадэмік АН БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, ветэран Вялікай Айчыннай вайны**

Перамога савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне пазбавіла ўсё чалавецтва ад карычневай чумы. Ужо ў саракавы раз мы сустракаем свята Першамая пад чыстым мірным небам.

Дню 1 Мая, 40-годдзю Вялікай Перамогі ва ўсіх калектывах рыхтавалі працоўныя падарункі. На ўдарных вахтах, якія праводзіліся ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, дасягнуты новыя поспехі ў справе камуністычнага будаўніцтва, умацавання эканамічнай і абароннай магутнасці нашай сацыялістычнай Радзімы.

Усенародным патрыятычным уздымам былі ахоплены вучоныя і выкладчыкі, студэнты і аспіранты, усе супрацоўнікі нашага універсітэта. Яны настойліва працавалі над ажыццяўленнем задач, якія пастаўлены партыяй і ўрадам перад савецкай вышэйшай школай.

Яшчэ большы прыліў энергіі і творчых сіл выклікаў у нас толькі што прайшоўшы красавіцкі Пленум ЦК КПСС, на якім з дакладам «Аб скліканні XXVII з'езда КПСС і задачах, звязаных з яго падрыхтоўкай і правядзеннем» выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС тав. М. С. Гарбачоў. Выканаць і перавыканаць узятыя сацыялістычныя абавязацельствы завяршальнага года адзінаццатай пяцігодкі — да гэтага імкнецца кожны член шматтысячнага універсітэцкага калектыву.

Нам ёсць аб чым рапартаваць слаўнаму Першамаю, роднай Камуністычнай партыі, любімай Айчыне. Многае зроблена для далейшага ўдасканальвання вучэбна-выхаваўчага працэсу, павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй, пашырэння і паглыблення навуковых даследаванняў, больш эфектыўнага ўкаранення ў вытворчасць дасягненняў навукі. Ужо сёлета выкладчыкамі і выпускнікамі аспірантуры універсітэта абаронена 6 кандыдацкіх дысертацый. Больш паспяхова вядзецца работа над падрыхтоўкай і завяршэннем доктарскіх дысертацый. Да новага працоўнага семестра актыўна рыхтуюцца студэнцкія атрады. Ва універсітэце іх сфарміравана 45. У працоўным семестры-85 прыме ўдзел каля 1.100 студэнтаў. На важнейшых народнагаспадарчых аб'ектах іх сіламі будзе асвоена не менш 800 тысяч рублёў капітальных укладанняў.

Разам са святам Першамая наш калектыў адзначае і чарговую гадавіну з дня стварэння Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Яго лепшыя прадстаўнікі ад усіх факультэтаў, кафедр і іншых структурных падраздзяленняў прымуць удзел у святочнай дэманстрацыі працоўных г. Гомеля. Яны яшчэ раз пакажуць сваю непахісную вернасць справе вялікага Леніна, справе нястомнай барацьбы за светлую будучыню — камунізм.

Ад імя рэктарата, парткома, грамадскіх арганізацый універсітэта горача віншую Вас, дарагія таварышы, са святам вясны, працы і міру. Новых Вам поспехаў на карысць нашай сацыялістычнай Радзімы!

## УРУЧАНЫ ВЫСОКІЯ ЎЗНАГАРОДЫ

19 красавіка г. г. у абкоме Кампартыі Беларусі вялікай групе ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны былі ўручаны ордэны Айчыннай вайны I і II ступеняў, юбілейныя медалі.

У зале сабраліся Героі Савецкага Саюза, поўныя кавалеры ордэнаў Славы, былыя воіны, партызаны і падпольшчыкі — тыя, хто ў кровапралітнай бітве з ворагам праявіў бяспрыкладную мужнасць і гераізм, унёс дастойны ўклад у Вялікую Перамогу.

Пры ўручэнні высокіх узнагарод Радзімы ветэранаў цёпла вітаў першы сакратар абкома КПБ А. С. Камай.

Сярод тых, хто першым у вобласці атрымаў заслужаныя ўзнагароды, быў дацэнт кафедры гісторыі КПСС нашага універсітэта, актыўны ўдзельнік партызанскага руху ў Беларусі Я. А. Семянчук. Яўгену Антонавічу ўручаны ордэн Айчыннай вайны І ступені і юбілейны медаль «Сорак гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 г.г.».

Ветэраны мінулай вайны выказалі сардэчную падзяку Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Савецкаму ўраду за пастаянныя клопаты і ўвагу да іх, запэўнілі, што і ў далейшым усе свае веды і багаты вопыт будуць аддаваць нястомнаму служэнню партыі і народу.

У гэтыя дні Я. А. Семянчук у саставе групы гамяльчан знаходзіцца ў сталіцы нашай Радзімы — Маскве. Разам з праслаўленымі былымі воінамі, партызанамі і падпольшчыкамі ён запрошаны на святочныя ўрачыстасці савецкага народа, прысвечаныя 40-годдзю Вялікай Перамогі.

## У ФОНД МІРУ

**Самае запаветнае для савецкіх людзей — захаванне і ўмацаванне міру на ўсёй планеце. На гэта яны накіроўваюць усе свае намаганні. Яскравым сведчаннем таго з'яўляецца і іх усямернае садзейнічанне Савецкаму Фонду міру.**

**Дастойны ўклад у агульнанародную справу ўносіць калектыў нашага універсітэта. Штогод на рахунак Савецкага Фонду міру ад яго паступаюць значныя грашовыя сродкі. Актыўна праводзіцца іх збор і сёлета — у год слаўнага юбілею Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і шырокай падрыхтоўкі савецкіх людзей да XXVII з'езда КПСС. За чатыры месяцы заключнага года адзінаццатай пяцігодкі вучоныя і выкладчыкі, студэнты і аспіранты, супрацоўнікі, рабочыя і служачыя ГДУ ўнеслі ў Савецкі Фонд міру каля 5 тысяч рублёў. Збор сродкаў на яго рахунак працягваецца.**

**ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ! НЯСТОМНА АВАЛОДВАЙЦЕ ВЕДАМІ, КУЛЬТУРАЙ, ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫМ МАЙСТЭРСТВАМ! ПРЫМНАЖАЙТЕ РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ, БАЯВЫЯ І ПРАЦОЎНЫЯ ТРАДЫЦЫІ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ І САВЕЦКАГА НАРОДА!**

**ВУЧЫЦЕСЯ ПА-ЛЕНІНСКУ ЖЫЦЬ, ПРАЦАВАЦЬ, ЗМАГАЦЦА!**

**(З Заклікаў ЦК КПСС)**

*СТУДЭНЦКІЯ КАНФЕРЭНЦЫІ*

# ПЕРШЫЯ СПРОБЫ—УДАЛЫЯ

У СТАЛІЦЫ нашай рэспублікі — горадзе-героі Мінску адбылася 42-я студэнцкая навуковая канферэнцыя філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Яна прысвячалася 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. У рабоце канферэнцыі ўдзельнічалі і прадстаўнікі ГДУ пяцікурсніца Галіна Цярлецкая, студэнткі адпаведна 4-га і 2-га курсаў Галіна Сугак і Тамара Міхалкіна, аўтар гэтых радкоў.

На яе былі запрошаны і будучыя філолагі з Казані, Калінінграда, Гродна, Тарту, Куйбышава. Адметным з'явілася тое, што са сваімі навуковымі дакладамі выступалі студэнты Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, рэспублік Конга і Мазамбік.

Лепшыя студэнцкія даследаванні былі адзначаны дыпломамі і граматамі. Прыемна, што ўсе студэнткі нашага універсітэта атрымалі граматы за грунтоўныя і актуальныя даклады.

Навуковая канферэнцыя студэнтаў у Мінску прайшла на высокім творчым узроўні. Яна засведчыла глыбокую зацікаўленасць будучых маладых спецыялістаў да сучасных праблем мовы і літаратуры, гісторыі іх развіцця.

Для мяне гэта была першая спроба сваіх здольнасцей, першая самастойная навуковая праца. І, безумоўна, хочацца, каб іх было больш. Пажадана, каб і наш універсітэт арганізоўваў у сваіх сценах такія канферэнцыі і на іх прыязджалі маладыя даследчыкі з іншых ВНУ краіны. Гэта, на маю думку, не толькі з'ядноўвае студэнтаў розных рэспублік, але і дазваляе яшчэ больш праявіць свае творчыя здольнасці.

**А. ЗАЙЦАВА,**
**студэнтка 2-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

# З НАДЗЕЯЙ НА НОВЫЯ СУСТРЭЧЫ

Літаратура і фальклор выключна плённа ўзаемадзейнічаюць паміж сабою, ўзбагачаюць адзін аднаго. Фальклор адыгрывае значную ролю ў развіцці літаратуры. Усе геніяльныя мастакі слова прыгажосцю і дасканаласцю сваіх твораў абавязаны перш за ўсё народу. Пісьменнікі шчодра запазычвалі ў вусна-паэтычнай творчасці народа важныя сюжэты, цікавыя характары, глыбокія ідэі, крылатыя прыслоўі. Літаратура, у сваю чаргу, праз кнігі, газеты, радыё ўплывае на творчасць народа. «Роднымі сёстрамі» назваў М. Рыльскі літаратуру і фальклор.

Справядлівасць гэтых слоў яшчэ раз пацвердзіла Усесаюзная студэнцкая канферэнцыя, якая адбылася ў Рызе ва універсітэце імя П. Стучкі. Яна была прысвечана 150-годдзю з дня нараджэння Кр. Барона, выдатнага фалькларыста, збіральніка латышскіх дайн. На канферэнцыю прыехалі прадстаўнікі РСФСР, Украіны, Беларусі, Малдавіі, Таджыкістана, Узбекістана, Кіргізіі.

У першы дзень работы канферэнцыі мы знаёміліся з фальклорам кожнай рэспублікі: з латышскімі дайнамі, украінскімі каламыйкамі, кіргізскім эпасам. Асобна нам, гасцям, была прачытана лекцыя аб латышскім фальклоры, каб мы змаглі ўключыцца ў абмеркаванне дакладаў латышскіх калег.

Другі дзень быў прысвечаны ўзаемадзеянню літаратуры і фальклору. Разглядалася выкарыстанне народных традыцый Ч. Айтматавым, І. Франко, М. Гарэцкім, народным мастаком Украіны М. Дзярэгусам. Кожны з дакладчыкаў імкнуўся зацікавіць слухачоў гісторыяй свайго народа, бо фальклор сапраўды адлюстроўвае яго побыт і погляды. Юнак з Украіны нават спяваў каламыйкі, каб данесці прыгажосць народнай украінскай песні.

Гонар прадстаўляць Беларусь на канферэнцыі атрымаў Гомельскі дзяржаўны універсітэт. У ёй прымалі ўдзел двое нашых студэнтаў: А. Казлоў і аўтар гэтых радкоў. А. Казлоў, студэнт 5 курса, гаварыў аб народнай аснове творчасці М. Гарэцкага, другі ўдзельнік канферэнцыі — аб уплыве фальклора на творчасць А. Куляшова.

Шмат цікавых мерапрыемстваў арганізавалі сваім гасцям латышскія сябры: мы хадзілі па Старой Рызе, любуючыся цудоўнай архітэктурай, наведалі музей этнаграфіі і побыту латышскага народа, пабывалі ў Домскім саборы. Але галоўнае тое, што ў нас з'явілася шмат новых сяброў з розных куткоў Савецкага Саюза. Ад'язджалі мы амаль са слязамі, нібы пакідаючы часцінку свайго сэрца, але з надзеяй, што гэта не апошняя наша сустрэча.

**А. ВОІНАВА,**
**студэнтка 2-га курса гістфіла.**

*Нашы традыцыі*

# ЦІКАВА, З ВЫДАТНЫМ НАСТРОЕМ

Гэтыя цудоўныя Дні матэматычнага факультэта!.. Дні ўсмешак, цікавых атракцыёнаў, вяселля і гумару. Весяляцца ўсе: першакурснікі і пяцікурснікі, асістэнты і дацэнты, весяляцца, забыўшыся на сваю дарослаць. І ўсюды пануе смех і гумар!

Такімі паўсталі перад намі чарговыя Дні матэматычнага факультэта — ДМФ-85. Адкрыліся яны кірмашом. Кожны змог знайсці сабе занятак па душы. Аматараў «вострых адчуванняў» прымаў «пакой страху», падарожнікі зрабілі захапляючую паездку «Вакол свету», для жадаючых атрымаць свой партрэт працавала «Фотаатэлье».

Новым мерапрыемствам, якое праводзілася ў час традыцыйных дзён, стала кніжная латарэя. Усе ўдзельнікі ФМФ-85 прынялі ў ёй актыўны ўдзел. Не менш актыўнымі на аўкцыёне былі госці свята з гарадоў Гродна, Данецк, Сімферопаль, Мінск, Днепрапятроўск.

У той жа дзень папоўнілася студэнцкая сям'я матфака. Першакурснікі, якія прайшлі свой першы выпрабавальны тэрмін — зімовую экзаменацыйную сесію — былі прыняты ў паўнапраўныя студэнты. Поспехаў у вучобе, у студэнцкім жыцці ім пажадалі пяцікурснікі член бюро гаркома ЛКСМБ Віктар Шведаў і ленінская стыпендыянтка Алена Махнова.

Вызначыўся сваёй арыгінальнасцю, выкананнем, тэмай «Медыум», які падрыхтавалі студэнты трэцяга курса. На суд гледачоў была прадстаўлена аперэта, якая мела вялікі поспех.

На наступны дзень праходзіў не менш цікавы конкурс паміж выкладчыкамі і студэнтамі. Каманды вялі ўпартую барацьбу за права быць першай. З вялікім энтузіязмам, знаходлівасцю выступала каманда дацэнтаў на чале з яе капітанам М. В. Селькіным. Але не адставалі і студэнты. І ў выніку — нічыя.

А твары гледачоў свяціліся ўсмешкай. Усіх саграваў агеньчык дружбы.

І вось адгучалі фанфары. Прайшлі, адшумелі Дні матэматычнага факультэта. Яны надоўга застануцца ў нашай памяці, таму што гэтае свята гумару і весялосці неабходна нам як разрадка, якая надае прыліў бадзёрасці і энергіі.

Да сустрэчы, ДМФ-86!

**Э. САВЯНОК,**
**студэнтка матэматычнага факультэта, член камітэта камсамола ГДУ.**

*КОНКУРСЫ*

# Перамаглі студэнты ГДУ

Секцыя французскай мовы (кафедра нямецкай і французскай моў) правяла конкурс сярод студэнтаў ГДУ на лепшы пераклад грамадска-палітычнага тэксту, прысвечаны 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. У ім актыўны ўдзел прынялі будучыя эканамісты і біёлагі.

Пераможцы агульнауніверсітэцкага конкурсу працягвалі спаборніцтва на веданне французскай мовы на алімпіядзе ВНУ г. Гомеля. Яе праграма прадугледжвала пераклад грамадска-палітычнага тэксту «40 гадоў таму назад», гутарку па тэмах: жыццё студэнта, вызваленчая місія савецкага народа ў другой сусветнай вайне, міралюбівая палітыка краін Варшаўскага дагавору на сучасным этапе.

Журы, у якое ўваходзілі выкладчыкі ГДУ, БІІЧТу, ГПІ і ГКІ, аднадушна прысудзіла першае месца за лепшы пераклад і добрае валоданне вуснай мовай чацвёртакурсніцы эканамічнага факультэта нашага уіверсітэта Алене Трыфунтавай. Другое месца падзялілі студэнтка групы 0-43 эканомфака ГДУ Ірына Дзегцярова і Л. Кордун з БІІЧТу, трэцяе — заняла першакурсніца гістарычнага аддзялення універсітэта Людміла Маскаленка.

Выкладчыкі кафедры нямецкай і французскай моў горача віншуюць пераможцаў гарадской алімпіяды і жадаюць ім далейшых поспехаў у вучобе.

**В. ВЕСЯЛОВА,**
**выкладчыца кафедры нямецкай і французскай моў.**

# ДА ЎВАГІ КУРАТАРАЎ І ПАЛІТІНФАРМАТАРАЎ!

**Рэкамендуецца правесці ў маі палітычныя інфармацыі і гутаркі на тэмы:**

**І. ПЫТАННІ ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ**

**1. XXVII з'езду КПСС — дастойную сустрэчу.**

У аснову палітінфармацый і гутарак пакласці ацэнкі, вывады і ўстаноўкі, змешчаныя ў матэрыялах красавіцкага (1985 г.) Пленума ЦК КПСС (гл. «Праўду» за 24 красавіка г. г.).

**2. Подзвігу партыі, подзвігу народа — жыць у вяках!** (Да 40-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне).

**3. Святу Перамогі — свята працы.** (Аб шырокай падтрымцы працаўнікамі гарадоў і вёсак рэспублікі патрыятычнай ініцыятывы перадавых калектываў краіны — правесці 4 мая Усесаюзны камуністычны суботнік, прысвечаны 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне).

Матэрыялы публікуюць усе газеты.

**ІІ. ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ І КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ**

**4. Міжнароднае свята юнацтва.** (Аб актыўнай падрыхтоўцы юнакоў і дзяўчат Краіны Саветаў і ўсяго міжнароднага маладзёжнага руху да XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве).

Матэрыял публікуе газета «Знамя юности». Гл. таксама часопіс «Агитатор», № 6 за 1985 г.

**ІІІ. ПЫТАННІ МІЖНАРОДНАГА ЖЫЦЦЯ І ПАЛІТЫЧНАГА ВЫКРЫЦЦЯ ІМПЕРЫЯЛІЗМУ**

**5. Ленінскім курсам міру і мірнага суіснавання.** (Аб паслядоўным знешнепалітычным курсе КПСС і Савецкага ўрада на пераадоленне небяспечнай напружанасці, развіццё мірнага супрацоўніцтва і канструктыўных асноў у міжнародным жыцці).

У палітінфармацыях і гутарках кіравацца матэрыяламі красавіцкага (1985 г.) Пленума ЦК КПСС.

**6. Капіталізм без прыкрас: у ценю небаскробаў.** (Аб раскошы і перасычанасці жыцця магнатаў ЗША, аб галечы, голадзе і адчаі абяздоленых).

Матэрыял апублікаван у штотыднёвіку «За рубежом», № 16 за 1985 г. Гл. таксама часопіс «Агитатор» № 5 за 1985 год.

# У ЛІКУ ЛЕПШЫХ

Студэнты ГДУ, якія вывучаюць нямецкую мову, з самага пачатку другога семестра бягучага навучальнага года рыхтаваліся да конкурсу на лепшага перакладчыка, прысвечанага слаўнаму 40-годдзю Вялікай Перамогі. У час заняткаў па нямецкай мове асаблівая ўвага ўдзялялася палітычнай лексіцы. Спачатку прайшлі конкурсы ў студэнцкіх групах, і іх пераможцы прынялі ўдзел ва універсітэцкім конкурсе, які праходзіў у два этапы ў пачатку красавіка. У ім удзельнічала каля 30 першакурснікаў і другакурснікаў. У цэлым, усе яны паказалі добрае веданне палітычнай тэрміналогіі, граматыкі замежнай мовы. Але ўсё ж лепшымі сталі Н. Архіпенка (гр. М-23), Л. Парошына (Ф-33), М. Тагер (Г-31), А. Савіцкая (БР-23), А. Рыдзеўская (Б-32), В. Крук (Г-31), С. Полаз (Т-23), І. Купцова (0-32), С. Каркунова (Р-31). Пераможцы будуць узнагароджаны граматамі і прызамі.

Нядаўна завяршыўся гарадскі конкурс на лепшага перакладчыка сярод студэнтаў ВНУ г. Гомеля. Яго арганізатарам стаў політэхнічны інстытут. Шчыра віншуем студэнтку гісторыка-філалагічнага факультэта ГДУ Алену Савіцкую, якая заняла ў гэтым конкурсе прызавое другое месца.

**Н. ЖОСТКАЯ,**
**выкладчыца кафедры нямецкай і французскай моў.**

